Аліна ВАЎРАНЮК

СЦЭНАРЫІ ЗАНЯТКАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ДЛЯ 1 КЛАСА ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЫ



Аліна ВАЎРАНЮК

СЦЭНАРЫІ ЗАНЯТКАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ДЛЯ 1 КЛАСА ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЫ

Scenariusze lekcji języka białoruskiego
dla kl.1 szkoły podstawowej

Opracowała
Alina Wawrzeniuk

Okładka, ilustracje
Mirosław Zdrajkowski

Zdjęcia prac uczniów (s. 108, 115, 121, 161, 173, 174)
i rysunki (s. 72, 73, 74, 86, 109) Alina Wawrzeniuk

Redaktor tecznicznY
Adam Pawłowski

© Copyright by Stowarzyszenie „AB-BA”

Białystok 2019

STOWARZYSZENIE NA RZECZ DZIECI
I MŁODZIEŻY UCZĄCYCH SIĘ JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO „AB-BA”
15-459 Białystok, ul. Częstochowska 6a lok. 8
www.ab-ba.com.pl

Książka jest finansowana przez Ministerstwo Edukacji Narodowej

Wydanie drugie poprawione

Родная мова пранікае ў чалавека ад зямлі, на якой ён нарадзіўся, ад людзей, сярод якіх ён жыве, ад бацькоў, якія далі яму жыццё і вырасцілі.
Радзім Гарэцкі

Гэтыя сцэнарыі — плён маёй шматгадовай настаўніцкай працы, у галоўным у Пачатковай школе № 4 у Беластоку. Я тут працую як настаўніца беларускай мовы з першакласнікамі з 1997 г. Раней беларуская мова ў Польшчы навучалася толькі з другога класа, таму і не было выпрацаванага метаду працы з першакласнікамі.

Мой план заняткаў мяняўся, паколькі кожны год прыносіў новыя дасведчанні, метады і спосабы працы з дзяцьмі, але я заўсёды кіравалася ў настаўніцкай працы наступнымі прадпасылкамі. **Галоўнай мэтай урокаў** у першым класе лічу асваенне дзяцей з беларускай літаратурнай мовай і пашырэнне іх моўнага слоўніка. **Галоўны метад працы** — гульня. **Тэмы заняткаў** павінны быць блізкія вучням, таму трэба гаварыць пра навакольны свет. Урокі беларускай мовы абавязкова трэба інтэграваць з іншымі прадметамі. Вучні павінны на ўроках слухаць, гаварыць, спяваць, маляваць, лічыць, дэкламаваць вершы, выцінаць, гуляць, пры чым, усё гэта рабіць па-беларуску.

Прыспеў час і я наважылася падзяліцца сваім дасведчаннем з іншымі настаўнікамі. У сцэнарыях урокаў беларускай мовы для першага класа, якія перад Вамі, я запланавала тэматычныя блокі згодна з порамі года, святамі. Пачала з тэмаў звязаных са школай і сям'ёй, з таго, што самае блізкае першакласнікам. Блокі складаюцца з некалькіх тэмаў і Вы можаце мяняць іх чарговасць. Гэта толькі прапанова, Вы можаце выбіраць тое, што лічыце патрэбным Вам і, галоўнае, Вашым вучням. Прапаную таксама дадатковыя тэксты, якія можаце выкарыстаць, арганізуючы свае ўрокі.

Я запісала толькі важнейшыя пункты заняткаў, не пісала кожнага пытання настаўніка і адказу вучня. Не распісвалася пра методыку заняткаў, звязаную з уводзінамі літаратурных тэкстаў, песень. Гэта ведае кожны настаўнік. Я палічыла, што лепш прапанваць канкрэтныя творы, песні, гульні, танцы і г.д. Настаўніку не трэба будзе ўжо нічога шукаць, бо яно сабранае ў гэтай кніжцы. Назірайце за сваімі вучнямі і выбірайце тое, што іх зацікавіць.

Міраслаў Здрайкоўскі падрыхтаваў прыгожыя карцінкі для размалёўкі, можаце рабіць ксеракопіі і раздаваць іх сваім вучням. Няхай малююць, называюць колеры, лічаць, разглядаюць, расказваюць, што ў якім месцы намалявана, няхай пазнаюць прыгажосць нашай роднай мовы.

Я ЎЖО ВУЧАНЬ

++++++

6. Пад канец урока прапануйце вучням навуку верша Р. Кляшторнай „Ветлівыя словы". Патлумачце незразумелыя словы. Пагавараце, чаму неабходна карыстацца гэтымі словамі.

Калі ласка, дзякуй,
Добры дзень —
Ветлівыя словы
Чую ад людзей.
Я таксама буду
Імі даражыць
З ветлівымі словамі
Лёгка жыць.

7. Гэта добры момант, каб вучні падпісалі кантракт, які абавязвае на ўроках беларускай мовы. Можаце яго падрыхтаваць раней, або рэдагаваць яго супольна з вучнямі.

8. Прыпамінаем свае імёны. Развітанне словамі „Да пабачэння".

Фама Ляшонак

СЦЕЖАЧКА ДА ШКОЛЫ

Лісцік жоўты за акном
Ападае долу...
Быў наш сад як родны дом,
Але час — у школу.

Развітання дзіўны час,
Сумны і вясёлы.
Пачынаецца для нас
Сцежачка да школы.

Сёння лялечны парад
Спачування варты...
Выбачай ласкава, сад,
Нам пара за парты.

++++++

9. Пакажыце вучням рысунак і прапануйце прыдумаць імёны для дзяўчынкі і хлопца. Палічыце і назавіце колькасць гукаў у імёнах. Назавіце кожны гук.
10. Раздайце вучням карткі з рысункамі. Прапануйце размаляваць клетачкі пад рысункам сінім і чырвоным колерамі.
11. Прапануйце вучням чарговую задачу: размаляваць рысункі каляровымі алоўкамі.
12. Вусная ацэнка рысункаў.
13. Прапануйце вучням яшчэ раз праспяваць песню „Нам сем гадоў".
14. Стоячы ўкрузе вучні па чарзе кажуць: Бы-вай (імя асобы якая стаіць злева з падзелам на склады). Развітанне.

++++++

8. Вучні называюць абсталяванне ў сваім класе, адказваючы на пытынні настаўніка тыпу:

- Што стаіць з правага боку?
- На чым сядзіш у школе?
- Што вісіць на сцяне?
- Што стаіць побач?
- Што стаіць перад табою?

9. Развітанне.



++++++

8. Вучні размалёўваюць рысункі школьных прадметаў.

9. Навука фрагмента верша С. Маршака „Беражы свае рэчы".

Рэчы не ўзніклі самі.
Людзі робяць іх рукамі.
... Кніжку, сшытак беражы,
Не запэцкай, не парві.

Гутарка, чаму трэба берагчы свае рэчы і як гэта рабіць.

10. Вучні прыпамінаюць назвы школьных прадметаў рашаючы загадкі:

Не кашуля, а сшыты. (сшытак)

Не куст, а з лісткамі,
Маленькага росту,
Прыгожага стану,
Хто яе знае, той веды мае. (кніжка)

Ляжыць паленца, а ў сярэдзіне сэрца. (аловак)

У заплечніку трымаеш,
Усё ў ім хаваеш. (пенал)

11. Настаўнік прапануе заспяваць песню „Нам сем гадоў".

12. Развітанне.

Даір Слаўковіч

РАЗУМНЫ АЛОВАК

Тата купіў тры алоўкі. Прыгожыя. Усе тры аднолькавыя.

— Яны — тры браты, — сказаў тата. — Але ніводзін пакуль маляваць не ўмее. Мы іх завострым і паспрабуем навучыць.

Завастрыў тата алоўкі і раздаў: адзін — Ірынцы, другі — Веранічцы, а трэці ўзяў сабе.

— Бярыце паперу, сядайце за стол, будзем маляваць.

Ірынчын аловак дом намаляваў і дым з коміна. Татаў — зайчыка і лес. А Вераніччын — нічога. Так, рысачкі і крамзулькі розныя.

— Чаму гэта твой аловак не хоча старацца? — пытаецца тата ў меншай дачкі.

— І сама не ведаю, — адказала дзяўчынка.

— Неразумны, відаць трапіў ёй, — паспагадала Ірынка.

— Трэба выкінуць і купіць новы, сказала Веранічка.

— Э, не. Так нельга. Ён жа невінаваты. Яго проста яшчэ не навучылі.

І пачалі тата з Веранічкай удваіх аловак вучыць. Веранічка трымае аловак, а тата — яе руку.

Аловак урэшце зразумеў, чаго ад яго хочуць, і старацца пачаў. Цяпер вучыла аловак толькі адна дзяўчынка, без таты.

З гэтага дня кожны вечар яны займаліся маляваннем. І з кожным днём выходзіла лепш і лепш.

А неяк Веранічка сказала:

— Паглядзі, тата, які разумны мой аловак: ужо намаляваў мячык і грыбок. А хутка і елачку навучыцца маляваць.





++++++

++++++

Дзеці вучацца верша з жэстамі, паказваюць па чарзе кулачкі, аглядаюць іх, лічаць пальчыкі.

8. Вучні на белай паперы адрысоўваюць свае рукі (пальчыкі). Выцінаюць іх.

Можам прапанаваць вучням з гэтых выцінанак зрабіць адну супольную працу.

Можам таксама прапанаваць вучням пакласці іх: зверху парты, знізу, справа, злева, побач дошкі, каля шафы і г.д.

9. Выкананне песні „Першакласнікі".

10. Развітанне.





Я І МАЯ СЯМ'Я

++++++

8. Навука вершыка „Дзе былі". Настаўнік ставіць пытанне: Дзе былі вы хлопчыкі й дзяўчынкі? Вучыць вершыка-адказу:

Мы ў школу ўсе хадзілі,
Мову родную вучылі.
Знаем слоў цяпер багата:
Дзед, бабуля, дачка, хата...

9. Прыпамінаем вершы. Развітанне словамі „Да пабачэння".

Уладзімір Ліпскі

ПРЫГОДЫ НУЛІКА

1. Хто такі Нулік

Жыў-быў Нулік.

Сумна жыў, абы-як. Спытаеце чаму? Ды таму, што быў адзінокі. Ні з кім не сябраваў, ні да каго не хадзіў у госці. Ды як ён мог пайсці, калі ў яго не было нават ног. І рук не было. І вачэй. І носа. І рота.

Нулік быў ніхто, нічый, ніякі.

Ён уяўляў сабою роўны абадок, які нібыта саскочыў з курынага яйка. Было яно абвязана дроцікам ад «носіка» да «пяткі» — і раптам вылузнулася з палону. А тая абвязка і стала Нулікам.

На што быў падобны Нулік?

Ды багата на што. На дзірку ад абаранка. На пялёсткі рамонка. На гадзіннік, пярсцёнак, абруч, кола. На савіныя вочы. На пятачок парасяці. На кольцы ў нажніцах.

Дзе жыў Нулік?

Ды абы-дзе. Мог жыць у мыльных бурбалках-пухірах. У клубах дыму. На пяску. На слівавых дрэвах. Нават на воблаках.

А што рабіў Нулік?

Ды нічога. Ён умеў толькі палежваць: то на правым баку, то на левым. Мог стаяць, калі нехта яго падтрымліваў, каб не кульнуўся. Той нехта мог быць ці гурбай снегу, ці сасновымі іголкамі, ці выпадковым ветрыкам.

...Задумаў і Нулік паспрабаваць шчасця. Захацеў і ён пабачыць свету. З дапамогай ветрыку пакаціўся Нулік па зялёнай траўцы, пасля — па сцяжынцы. Выскачыў на шырокую роўную вуліцу. Каціўся, каціўся, пакуль не стукнуўся аб сцяну высокага цаглянага дома. Упаў Нулік на асфальт. Думаў, тут яму і канец надышоў. Ды раптам яго нехта падняў...

++++++

Гэта — роцік,
Гэта — губкі,
Гэта — зубкі,
Гэта — вушкі,
Гэта — маміны дачушкі!

Дзеці паўтараючы вершык паказваюць часткі твару. Дзеляць назвы на склады і на гукі.

7. Вучні дарысоўваюць часткі твару на сваіх рысунках.

8. Дзеці адказваюць на пытанні тыпу: Што ў цябе над вачыма? Што ніжэй носа? і г.д.

9. Гульні з вершыкамі.

Прапануйце вучням, каб паўтаралі рухі згодныя з вершыкам.

Вусны трубачкай скручу — вось так, вось так,
Носік ўгору падыму — вось так, вось так,
Шчочкі надзімаю — вось так, вось так,
Бровы падымаю — вось так, вось так.

У кожнага з нас ёсць язык. Дзякуючы яму мы гаворым. Выканайце рухі языком згодна з вершыкам.

Язычок мой, язычок,
Паслухмяны таўсцячок,
Уніз, уверх, управа, улева
Бегай спрытна, жвава, умела.

10. Паўтарэнне верша і гульняў. Развітанне.

++++++

6. Размова на тэму, што неабходна мець чалавеку, каб быць акуратным (зубная шчотка, зубная паста, насавая хустачка, мыла, грэбень і г.д). Назвы дзелім на склады і на гукі.

7. Настаўнік прапануе вучням гульню ў „Хустачку".

На стале пад хусткай схаваны адзін з прадметаў па тэме (люстэрка, грэбень, мыла, зубная паста, зубная шчотка). Дзеці гавораць вершык:

Хустачка, хусцінка,
Падыміся, бы пярынка,
Паляці да неба.
Ведаць нам трэба
Ні многа, ні мала,
Толькі — што схавала.
Настаўнік адказвае:
Я нічога не скажу.
Адгадайце — пакажу.

Пасля правільнага адказу дзеці адварочваюцца, настаўнік мяняе прадмет.

8. Навука верша „Прачынаюся я рана".

Прачынаюся я рана.
Мыюся вадой з-пад крана.
Мыю ручкі, мыю шчочкі,
Мыю вушкі, мыю вочкі.
Грэбенем я прычашуся,
У люстэрка пагляджуся.
Я і мыла не баюся!

9. Развітанне.

++++++

8. Настаўнік прапануе зрабіць у групах плакаты на тэму: „Гігіена", якія будуць напамінаць усім пра тое, што неабходна быць акуратным. Трэба, вядома, растлумачыць самое слова і спосаб выканання плакатаў, падзяліць вучняў на групы.

9. Разляд і ацэнка выкананых плакатаў.

10. Развітанне.

++++++

людзям, якія ня ўмеюць майстраваць самі; таму мне не прыходзіла ў галаву, што гэта ўсё прызначалася мне.

Ласэ й Босэ перацягнулі мой ложак праз усё гарышча ў мой новы пакой...

Першае, што я тады зрабіла, дык пабегла ў Ласэў ды Босэў пакой ды забрала адтуль свае лялькі. У мяне чатыры малыя й тры вялікія лялькі, бо ўсіх іх змалку я беражліва захоўваю. Для малых лялек я ўсталявала файны пакойчык у шуфлядзе кніжнай паліцы. Спачатку я паклала кавалак чырвонай тканіны, як бы дыван, потым парасстаўляла там прыгожую лялечную мэблю, якую мне на Каляды падаравала бабуля, а пасьля паставіла прыгожыя лялечныя ложачкі й, нарэшце, паклала самі лялькі.

...Сапраўды, гэта быў цудоўны дзень, калі я займела свой уласны пакой...

6. Размова на тэму зместу заслуханага фрагмента кніжкі.

7. Настаўнік прапануе вучням зрабіць сваю кватэру з лялечнай мэблі. Пры нагодзе «кватэравання» называем усю мэблю, дзелім назвы на склады і гукі. Па чарзе «будуем» усе памяшканні: кухню, сталовую, спальню, дзіцячы пакой, пярэдні, прыбіральню.

8. Дзеці расказваюць пра свае кватэры.

9. Настаўнік раздае вучням рысункі з пакоям Лізы. Дзеці называюць усю мэблю і колеры згодна з пачутым тэкстам.

10. Выкананне рысункаў. Паказ прац.

11. Развітанне.

++++++

Ён па рэйках так імчыцца.
Дым наўкол яго кружыцца.
Цягне ён за возам воз.
Як завецца?
(паравоз)

Вельмі мяккі ён, калматы,
Падарунак мамы, таты.
Мае цацкі сцеражэ,
Сон-дрымоту беражэ.
Сябра лепшага не маю,
З ім у ложку засынаю.
(сабака)

З іх я пабудую дом,
Крэпасць ці аэрадром.
А затым, як пагуляю,
Зноў у скрынку іх складаю.
(кубікі)

11. Развітанне.



++++++

Лідзія Арабей

ЛЯЛЬКА

У магазіне на паліцы стаялі лялькі. Іх толькі што прывезлі з фабрыкі і паставілі адну пры адной, каб той, хто захоча купіць, мог выбраць лепшую. А выбраць сярод іх адну было нялёгка, бо ўсе яны былі падобныя, як блізняты. Усе са светлымі кучаравымі

валасамі, з блакітнымі вочкамі, пухлымі ружовымі шчочкамі і чырвонымі вуснамі. І прыбраныя былі аднолькава: у зялёных сукеначках, з фальбонкамі на рукавах і каля шыйкі, на ножках — зялёныя чаравічкі з белымі шкарпэткамі. Але хоць і выглядалі аднолькава, кожная мела свой характар. Адна была вясёлая, другая — добрая, трэцяя — капрызная. Ды характар не ўбачыш так проста, як сукенку.

Словам, лялькі стаялі на паліцы і чакалі сваёй гаспадыні. Дзяўчынка, якую звалі Марынка, доўга глядзела на іх, пакуль не паказала пальчыкам на адну:

— Вось гэту!..

Лялька ўзрадавалася, што выбралі менавіта яе, і адразу палюбіла дзяўчынку, вырашыла доўга і шчыра з ёю сябраваць. Гэтая лялька была добрая.

Марынка ўзяла ляльку і пайшла дадому. Кожны дзень з ёю забаўлялася: карміла кашаю з лыжачкі, укладвала спаць. А калі ішла гуляць — брала ляльку з сабою.

Але мінуў час, Марынка пайшла ў школу, у першы клас. У яе з'явіліся кніжкі, і з імі ёй ужо было цікавей, чым з лялькаю.

Добрая лялька ўсё разумела і не крыўдзілася на Марынку, хоць без дзяўчынкі вельмі сумавала.

Зрэдку, праўда, Марынка яшчэ ўспамінала пра ляльку. Аднойчы ўзяла яе на двор разам з кніжкаю. Села на лаўку, ляльку паклала побач, а сама пачала кніжку гартаць. Ды тут раптам бліснула маланка, загрымеў гром, паліў дождж. Марынка схапіла кніжку і пабегла хавацца ад дажджу, а пра ляльку забылася. Не ўбачыла нават, як тая звалілася з лаўкі ў пясочніцу.

Ляжала лялька ў пяску пад дажджом, было ёй вельмі холадна. Яна адчувала, як прамакае наскрозь яе сукеначка, як кудлацяцца валасы, як змывае дождж з яе шчочак ружовую фарбу. Ёй хацелася паклікаць некага на дапамогу, але яна не ўмела гаварыць і моўчкі трывала пакуты.

Успомніла Марынка пра ляльку, калі дождж аціх. Пайшла ў двор шукаць. Лялька ляжала ў пясочніцы — брудная, непрыгожая.

«Навошта мне такая брыдкая лялька?» — падумала Марынка. Пакінула ляльку ў пяску і пайшла ў хату.

Хоць лялька і была добрая, але гэтым разам моцна пакрыўдзілася на Марынку: хіба можна пакідаць у бядзе сваіх сяброў?..

Следам за Марынкаю ішлі дзяўчынка з мамаю.

— Глядзі, мама, лялька, — сказала дзяўчынка. — Можна, я вазьму яе?

— Яна мокрая, брудная.

— А я яе памыю. І сукеначку памыю, і валасы прычашу.

Мама пастаяла, падумала.

— Ну, добра, вазьмі, Алінка...

Дзяўчынка падняла ляльку з пясочніцы. Лялька так узрадавалася, што аж заплакала.

А дзяўчынка падумала, што гэта ў яе вочках свецяцца кропелькі дажджу.

УЖО ВОСЕНЬ

++++++



++++++

„Грушка” танцуе і скача.

А ўжо наша грушка
распусцілася,
а наша Марылька
зажурылася!

„Грушка” стаіць нерухома.

А мы тую грушку
весяліць будзем.
І з нашай Марылькай
скакаць будзем.

Усе ўдзельнікі гуляюць, скачуць.

6. Навука верша „На здароўе!”.

Ешце, дзеткі,
На здароўе
У сцюдзённае надвор’е:

Грушы,
Ківі,
Мандарыны,
Ананасы,
Апельсіны.

Не забудзьце пра цытрыны!

7. Настаўнік прапануе размаляваць рысункі з фруктамі: ківі, ананас, мандарын, банан.

8. Развітанне.



++++++

Гэта што за важны туз,
хвост зялёны,
чэпкі вус?
Усім вядомы карапуз
Пузан Пузанавіч ... (арбуз).

З вусамі, а не стары.
Зайздросныя вочы.
За што-небудзь на двары
ўчапіцца хоча.
Хопіць хітрасці на трох.
Ну, на тое ж ён ... (гарох).

4. Настаўнік знаёміць вучняў з тэмай урока.

5. Дзеці называюць вядомую ім гародніну. Назвы агародніны дзелім на склады і на гукі.

6. Размова пра тое, для чаго выкарыстоўваем агародніну і чаму карысна яе есці.

7. Гульня „Рэдзька".

Дзеці выбіраюць „Яся" і „гаспадара". Усе астатнія ўдзельнікі гульні, гэта „рэдзькі". „Ясь" адыходзіць убок. „Рэдзькі" сядаюць адна за адной і абымаюць рукамі таго, хто сядзіць спераду.

„Ясь" стукае палкай аб падлогу.

„Гаспадар" пытае: — „Хто там?".

„Ясь": — Ясь!

„Гаспадар": — Што табе трэба?

„Ясь": — Скінуўся з печы,
Пабіў сабе плечы.
Охаю, уздыхаю,
Рэдзькі жадаю.

„Гаспадар": — Вырві сабе рэдзьку, толькі не рві карэньчык!

„Ясь" падыходзіць да „градкі" (канца чаргі дзяцей) і пачынае „рваць" рэдзьку, якая сядзіць апошняй.

Рэдзькі моцна трымаюцца. Вырваўшы рэдзьку „Ясь" гаворыць: „Ідзі рэдзька на дапамогу!". Кожная „вырваная" рэдзька дапамагае „Ясю" рваць наступную.

8. Навука верша Віктара Шведа „Градкі".

Выдзяліла матка
Ганулі дзве градкі.
На градках Гануля
Садзіла цыбулю,
А таксама трошкі
Фасолі, гарошку,
Пятрушкі, шпінату,
Радыскі, салаты,
Памідораў, агуркоў,
Маку, морквы, буракоў.
Хоць было ўжо густа -
Яшчэ і капусты ... .

9. Прыпамінаем назвы гародніны. Флэш-гульня на аснове верша „Кухарка" з сайта www.dzietki.org.

10. Развітанне

++++++

Палівалі мы бурак
Вось-вось гэтак, вось-вось так.
І палолі мы бурак
Вось-вось гэтак, вось-вось так.

Вырывалі мы бурак
Вось-вось гэтак, вось-вось так.

Што яшчэ цікавіць вас?
Вось які бурак у нас!

Бура-бура-бурачок
Паказаў з зямлі бачок.
Бура-бура-бурачок —
Вельмі смачны таўсцячок.

Пры дэкламацыі верша дзеці паказваюць чарговыя дзеянні.

7. Гульня „Што кладзеш у кошык ты?".

Настаўнік ставіць кошык, а побач яго кладзе агародніну („жывую" або рысункі). Гаворыць вершык:

Раз-два, раз-два,
Ураджай збіраць пара.
Раз-два-тры, раз-два-тры,
Што кладзеш у кошык ты?

Дзеці кладуць у кошык агародніну і адказваюць поўным сказам.

8. Развітанне.

++++++

Скінь калючую адзежку,
Вылязай, каштанік!
Прыпеў: Хто не ўлез, у жменьку возьмем...
У мяне іх многа-многа,
Болей, чым у таты.
Набяру — і з перамогай
Вернемся дахаты.
Прыпеў: Хто не ўлез, у жменьку возьмем...
Дома сумаваць не стану,
Будзе суцяшэнне:
У мяне цяпер каштанаў
Поўныя кішэні.
Прыпеў: Хто не ўлез, у жменьку возьмем...

- Практыкаванні з голасам.
  Вучні стаяць у крузе.
  Кожны з іх набірае паветра носам і памалу выпускае яго ротам.
  Паўторы (голасна, ціха, хутка, павольна) скорагаворкі:
  Раз — каштан,
  Два — каштан,
  Тры, чатыры, пяць...
  Не злічыць усіх наўкола,
  Трэба іх збіраць.
- вучні ціха падпяваюць мелодыю песні,
- навука чарговых радкоў песні — вучні паўтараюць іх,
- спробы супольнага спеву.

7. Выкананне ў групах прац з каштанаў і жалудоў.

Падзяліце вучняў на некалькі груп (па 4 асобы), раздайце жалуды, каштаны, зубачысткі і пластылін. Прапануйце ім стварыць свае кампазіцыі.

Калі гэта I клас, пакажыце як і што яны могуць зрабіць.

У той час, калі дзеці працуюць, чуваць песню „Каштаны", якую дзеці могуць падпяваць.

8. Паказ прац і выкананне выставы.

9. Падвядзенне ўрока. Размова пра настрой у песні „Каштаны".

Прапануйце дзецям выбраць два колеры каляровых алоўкаў, якія асацыююцца ім з песняй. Вучні трымаюць іх у руках і пад песню „Каштаны" малююць напераменку раз правай, раз левай рукой на белай паперы, прыклеенай да парты.

10. Развітанне.

Невядомы аўтар,
пераклаў з польскай мовы Уладзімір Сіўчыкаў

Асыпаецца лістота

Асыпаецца лістота
маляўніча.
Гэта восень жаўталісце
ветрам кліча.

Ляціць лісце, ляціць з клёна
і каштана.
Дол барвяна-залацістым
сёння стане.

На стале паставім з лісця
шмат букетаў.
Будзем радасцю і водарам
сагрэты.

++++++

Агратэхніка, канешне,
Дала вынік самы лепшы:
Рэпка вырасла на славу:
Вышэй плота, вышэй лавы,
Уся жоўтая, бы сонца,
Так і просіцца ў ваконца.

Як паспела, дзед прыйшоў,
Каб забраць яе дамоў.
Ірвануў раз, другі, трэці...
Што такое? Ані з месца!
Мусіць, трэба дапамога.
— Бабка! Выручай старога!
Як жа не дапамагчы?
Бабка кінула пячы,
Падхапілася ды к дзеду.
Сама думае: „К абеду,
Мабыць, будзе рэпа ў нас.
Наямося, ды за квас!"

Падбягае... Штось не так:
Рэпа ў градцы, дзед — як грак,
Разгубіўся, ледзь не плача.
Баба ж з злосці ледзь не скача:
— Ты чаго стаіш, дурны?
Хапай рэпу ды цягні!
Ужо даўно кіпіць у печы.
Ты ж займаешся тут нечым!

Раззлаваўся тут і дзед.
— Што крычыш, як наш сусед?
Паспрабуй сама вазьмі,
Гэту рэпу пацягні!
Гырчыць баба, бы індык:
— Ты мужык ці не мужык?
Я тут буду рэпу рваць,
А ты што ж? Адпачываць?!
Ах, такі ты, растакі!"
Крык ляціць ва ўсе бакі.

Слова — дзед, а баба — два.
Ды сварыліся дарма:
Покуль сварка дагарэла,
Тую рэпку мышка з'ела.
Не адна, вядома, з Жучкай,
З Коткай разам ды з Унучкай.

Паглядзелі дзедка з бабкай
На сваю пустую градку
І рашылі, што ўжо болей
Не пасварацца ніколі.

10. Выказванні пра змест тэксу і розніцы між новым і старым варыянтам казкі.

11. Гульня „Агароднік".

Вучні становяцца ўкруг і выбіраюць сабе назву гародніны. Выбіраем „агародніка", які выходзіць на сярэдзіну і стукае палкаю аб падлогу.

Дзеці: — Хто там?
„Агароднік": — Агароднік.
Дзеці: — За чым прыйшоў?
„Агароднік": — За рэпай.
„Агароднік" адгадвае (можа тры разы), хто з дзяцей назваў сябе рэпай. Калі адгадае, рэпа ўцякае. Калі „агароднік" зловіць „рэпу", вядзе яе ў свой „агарод". Калі не адгадае, мянем „агародніка".

12. Настаўнік прапануе вучням пабыць паэтамі і скласці верш.

Паказвае вучням рысункі агародніны, а яны называюць яе.

Агародніны поўная міска:
Вось бульба, цыбуля, радыска,
Горох, памідор, агурок,
Вось морква, бурак і часнок,
Пятрушка, і кроп, і салата.
Ураджаю ў нас сёння багата.

13. Развітанне.



++++++

Ты і хлеба нам дала.
Ну, а добрае надвор'е
Ты для нас не прыпасла?
— Я пашлю вам дожджык з неба!
— Не, не хочам! Нам не трэба!
Дожджык, не перашкаджай,
Мы збіраем ураджай,
Будзе ў нас багаты год,
А цяпер — у карагод!

Дэкламуем верш з падзелам на ролі. Настаўнік — тэкст Восені, а дзеці — астатнія радкі.

6. Размова пра змест верша.

Настаўнік засяроджвае ўвагу дзяцей на тым, што прыносіць Восень у вершы.

7. Настаўнік раздае вучням па шэсць рысункаў, на іх лісткі рабіны, дуба, каштана і плады з гэтых дрэў.

Задача вучняў — спалучыць іх у пары і назваць. Дзелім назвы на склады і на гукі. Вучні могуць размаляваць рысункі і прыклеіць пары на аркушы паперы. Трэба звярнуць увагу дзяцей на колеры лісткоў.

8. Гульня „Кропіць дожджык".

Кропіць дожджык, кропіць дожджык, (імітуем дождж)
Вецяр, вецярок. (імітуем вецер)
Тут ляціць лісток, там ляціць лісток. (імітуем ападанне лістоў)
Каляровы, каляровы свет. (кружымся)

9. Дэкламацыя верша „Восень".

10. Развітанне.

++++++

Віктар Швед

ВОСЕНІ ПЛАДЫ

Сонечны асенні ранак.
Дзьмухнуў вецярок пявучы,
З дрэваў падаюць каштаны
Панцыр скінуўшы калючы.

Колькі ж іх чырванабокіх
Спачывае ў дрэваў ценю!
Школьнікі ідуць на ўрокі,
Іх збіраюць у кішэні.

Колькі ж сонейкам сагрэтых
Пад магутным старым дубам
Спіць у кругленькіх берэтах
Жалудоў — аж глянуць люба!

Іх таксама возьмуць дзеці.
Пасля ўрокаў, нечакана,
Зробяць многа розных рэчаў
З жалудоў тых і каштанаў.

++++++

ЗІМОВЫЯ ГУЛЬНІ

++++++

++++++

++++++

++++++

6. Выкананне снегавіка з кардону.

Вучні сядзяць у групах, па чатыры асобы. Настаўнік дае ўсім групам шаблоны (тулава, галава, капялюш). Дзеці адрысоўваюць на белым кардоне галаву і тулава, на чорным капялюш. Затым выцінаюць адрысаваныя элементы. Настаўнік дапамагае выцінаць дзіркі на пальцы. Дзеці робяць яшчэ чорныя вочы і гузікі (дзеці могуць іх проста намаляваць), нос з аранжавага кардону. Калі ўсё гатовае, трэба склеіць усе элементы: тулава, капялюш, галава. Ахвотныя вучні робяць яшчэ мятлу, шалік з крэпіны і г.д.

7. Гульні са снегавікамі.

8. Развітанне.



ЭЙ, КАЛЯДАЧКІ...

++++++

Васіль Жуковіч

КАЛЯДНІКІ

Ідуць каляднікі, ідуць
па ўсёй краіне самабытнай,
сцяжынку з даўніны вядуць
пад зыркай зоркай старажытнай.

Ідуць вясёлай грамадой,
народ вітаюць калядой.

Сцяжынку памяці вядуць;
што ім зімовы рэзкі вецер!
Ідуць каляднікі, ідуць -
любві, надзеі, веры дзеці.

++++++

прыемна так з ёлкай
сустрэць Новы год.
У цацкі прыбрана...

6. Вучні напамінаюць назвы зімовых месяцаў.

7. Развітанне.

Уладзімір Ліпскі

ПРЫГОДЫ НУЛІКА

12. Тры, чатыры, пяць...

Міколку спадабалася быць настаўнікам.

Цяпер ён кожны дзень вучыў Нуліка ўсяму, што сам ведаў. А найбольш яму падабалася матэматыка. Міколку хацелася, каб і Нулік пасябраваў з лічбамі, сваімі родзічамі.

— Сёння будзем пісаць лічбу **3**, — аб'явіў Міколка.

Ён узяў чысты сшытак у клетачку, ручку і вывеў тройку, вельмі ж падобную на літару «З». Патлумачыў:

— Лічба **3** складваецца з двух паўнулікаў.

— Як гэта? — здзівіўся Нулік.

— А вось так: у правым куточку клетачкі ставім кропку, ад яе выпісваем паўкруг, як маладзічок. Ад яго выкручваем уніз новы паўкруг. Лічба гатова!

Нулік цярпліва пазіраў, як Міколка вадзіў ручкай па паперы. І сам паспрабаваў напісаць лічбу 3. Праўда, яна ў яго атрымалася не такая роўная, як у настаўніка.

— Слухай, Міколка, а што гэтай лічбай можна рабіць? — спытаў Нулік.

— Ну-у, — задумаўся Міколка, — помніш, мы чыталі казку пра Ніф-Ніфа, Нуф-Нуфа і Наф-Нафа?

— Ага, цікавая казка пра парасят.

— А колькі іх?

— Тры!

— Вось бачыш, лічба **3** і спатрэбілася, — задаволена сказаў настаўнік.

— Ага, там сярод іх быў адзін самы разумны, як ты.

— Не абзывайся, — папярэдзіў Міколка і прадаўжаў тлумачыць: — А яшчэ лічбай **3** можна палічыць галовы ў Змея Гарыныча. Іх тры!.. З трох фламастэраў можна скласці трохвугольнік.

— Ну, складзі, — папрасіў Нулік.

Міколка выканаў яго просьбу і выдаў новую прыдумку:

— Лічбай тры можна пералічыць нашу сям'ю: мама, тата і я — іх сын.

— А бабуля? — нагадаў Кулік.

— Бабуля — чацвёртая, — пагадзіўся Міколка.

— А я?

— Ты — пяты. Правільна, цяпер у нашай кватэры пяць жыхароў.

Міколка навучыў Нуліка пісаць лічбы 4 і 5.

А бабуля тым часам закончыла вязаць рукавічку і загадала загадкі на лічбы **3, 4, 5**. Вось яны:

— Пяць брацікаў у адным доміку жывуць. Што гэта?

— На чатырох нагах стаіць, а хадзіць не можа. Што такое?

— Два бацькі і два сыны падзялілі паміж сабой тры яблыкі так, што кожнаму дасталося па аднаму яблыку. Ці можа так быць?..

++++++

Залатымі шышкамі
Мы асыплем елачку.

Загарыся свечкамі
Залатымі, яснымі.
Слава Богу Ўзвышняму,
На зямельцы шчасцейка.

7. Развітанне.

Ларыса Геніюш

Ёлка

Ёлка наша, ёлачка –
Кругом цацкі, зорачкі,
Залаты ражок
І сцяжок, сцяжок.
Шнур з сярэбрашых
Ніцей
І падаркі для дзяцей.
Будзем весела спяваць,
Кругом ёлкі танцаваць,
Будзем вершы гаварыць,
Будуць мамы ў ладкі біць.
Калі прыйдзе Дзед Мароз,
Папытаем: "Што прынёс?"

++++++

6. Глядзім філь „Калядная гісторыя” http://belsat.eu/be/nasze_programy/episode/m,4558,kaliad-naia-ghistoryia.html

7. Выказванні вучняў на тэму фільма.

8. Вучні спяваюць вядомыя ім калядкі.

9. Развітанне.

НАШЫЯ БАБУЛІ

++++++

Святыя іконы,
Круглы серп зублёны,
Вялікія кросны,
Кадаўбец дзівосны,
Каменныя жорны,
Дзяжа на хлеб чорны,
Стары калаўротак,
Са сноўніцай мотак,
Гладкая качалка,
Крэсіва — запалкі...
У нябыце хата
І ўсе экспанаты.

10. Развітанне.

Алесь Якімовіч

ПЕРШАЕ ЯЕЧКА

Хадзіў дзед на паляванне. Паляваў ад ранку да змяркання. Зморыцца, аж слова не прамовіць, а звярыны не зловіць. Ідзе дахаты, ледзь не плача.

Вось дык няўдача!

Баба дзеда лае, што дарма гуляе, топча лапці, ірве аборы. Ну і гора!

Слухаць дзеду горка бабіну гаворку.

— Ты, баба, мяне не лай! Злаўлю табе звера: чакай!

Цэлы дзень дзед хадзіў, курку-рабку злавіў.

Рада баба, скача, а курка кудахча: „Куд-куды, куд-куды! Дайце грэчкі і вады!".

Бабка курку накарміла, вадою напаіла. Села курка на вечка ды знесла яечка.

Бегла мышка пад скрыначку, цягнула скарыначку, хвастом вільнула, яечка скранула.

Яечка скацілася — трах! — і разбілася...

Убачыла баба, загаласіла ды з жалю ўсе гаршкі пабіла. Сама сярод хаты села і — абамлела...

Тут дзед стрэльбу схапіў, порахам набіў. Кінуўся да мышкі, а мышка — на вышкі.

Дзед за ёю:

— Ілжэш! Ад мяне не ўцячэш!

За парог зачапіўся і паваліўся.

Набіў дзед гузак з добры кулак. Ляжыць, уздыхае, мышку лае.

Ішлі бабы па ваду, пабачылі тую бяду, пачалі рукамі махаць, людзей на дапамогу склікаць.

Прыбеглі старыя, за старымі — малыя. Дзеда паднялі, бабу вадой адлілі.

Вось дык бяда!

А пакуль там крычалі ды бедавалі, курка села ў падпечку ды знесла другое яечка. Круглае, белае, моцнае, спелае. Яшчэ лепшае за першае!

Рада баба, рад і дзед: будзе яечня на абед!

Баба патэльню ўзяла, яечню спякла. Паклікала гасцей — старых і дзяцей.

Усе елі колькі хацелі. З-за стала ўсталі, песні заспявалі. Узяліся за бокі, пусціліся ў скокі.

Скакалі, скакалі ды годзе сказалі.

Вось вам і казка. Чытайце, калі ласка!

++++++

++++++

А мая бабуля казкі
Любіць
Баіць-гаварыць,
Цэлы вечар
Будзеш слухаць,
Сон не здолее змарыць (...)
Безліч казак бабка знае,
Іх заўжды ахвотна бае.

І таму
Шануюць дзеці
Сваіх бабак нездарма,
Бо для іх
Нікога ў свеце
Ласкавейшага няма.

7. Народная беларуская казка „Як кот звяроў напалохаў".

Жыў дзед ды баба. І быў у іх кот. Дзед кашалі плёў, баба кудзелю прала, а кот; паляваць на мышэй хадзіў.

Вось пайшоў раз кот у лес на паляванне ды і заблудзіўся. Шукаў, шукаў дарогу дадому — не знайшоў. Сеў пад ялінай і плача

Бяжыць лісіца. Убачыла ката, заглядзелася: ніколі яшчэ такога звера ў сваім лесе не сустракала!

— Ты хто такі будзеш? — пытаецца.

— Я — Кот Мурлыковіч.

— А чаго ж ты плачаш, Кот Мурлыковіч?

Расказаў ёй кот аб сваёй прыгодзе.

— Хе, — кажа лісіца, — каб толькі тае бяды! Ідзі да мяне жыць. Будзеш у мяне за гаспадара.

— Добра, — кажа кот.

Вось прыходзіць ён да лісіцы. А ў яе курэй — і смажаных, і вараных. Наеўся кот і спаць уклаўся.

Тым часам бяжыць па лесе воўк: топ-топ, шлёп-шлёп!

Пачула лісіца, выскачыла з хаты ды як закрычыць:

— Хто гэта ў маім лесе стукоча-тупоча? Хто майму гаспадару спаць не дае?

— А хто ж у цябе гаспадар? — пытаецца воўк.

— У мяне не гаспадар, а гаспадарышча, хвост з памялішча: як махне, дык адразу заб'е.

Узяла ваўка цікавасць. Ён і кажа:

— А ці нельга было б, кумка, хоць адным вокам паглядзець на твайго гаспадара?

— Паглядзець-то можна, — адказвае лісіца, — але без падарунка лепш не прыходзь. Мой гаспадар падарункі любіць.

— Добра, будзе падарунак, — сказаў воўк і пабег далей.

Вярнулася лісіца ў хату.

А тым часам ідзе па лесе мядзведзь: трэсь-лом, трэсь-лом, трэсь-лом!

Пачула лісіца, выскачыла з хаты ды як закрычыць зноў:

— Хто гэта ў маім лесе трашчыць? Хто майму гаспадару спаць не дае?

— А хто ў цябе гаспадар? — пытаецца мядзведзь.

— У мяне не гаспадар, а гаспадарышча, хвост з памялішча: як махне, дык адразу заб'е.

І мядзведзя ўзяла цікавасць: які такі гаспадар у лісіцы, што хвастом усіх забівае? Вось ён і кажа:

— А ці нельга было б, лісічка-сястрычка, хоць паглядзець на твайго гаспадара?

— Паглядзець можна,- кажа лісіца. — Толькі без падарунка не прыходзь. Мой гаспадар падарункі любіць.

— Добра, падарунак будзе, — сказаў мядзведзь і пайшоў далей.

Прабеглі яшчэ дзік-сякач і заяц-шарак. Лісіца і іх сваім гаспадаром напалохала.

Сабраліся звяры і моцна задумаліся: якія ж ім падарункі лісіцынаму гаспадару прынесці?

Думалі-гадалі, нарэшце мядзведзь і кажа:

— Вось што, браткі, трэба смачны абед згатаваць ды ў госці яго з гаспадыняй запрасіць. Тады ўсе разам і паглядзім.

— Добра, няхай будзе так, — згадзіліся звяры.

І тут зноў яны моцна задумаліся: які абед згатаваць? Думалі-гадалі, нарэшце мядзведзь і кажа:

— Я прынясу мёду калоду.

— А я — барана, — кажа воўк.

— А я — жалудоў, — кажа дзік.

— А я — салодкай капусты, — кажа заяц.

Згатавалі абед і пачалі раіцца, каму запрашаць ісці. Мядзведзь кажа:

— Я тоўсты, мне хадзіць цяжка. Воўк кажа:

— Я і так набегаўся, мне ногі баляць. Дзік кажа:

— А я складна гаварыць не ўмею.

А заяц нічога не сказаў. Вось і вырашылі паслаць яго, як лягчэйшага на ногі.

Прыбег заяц да лісіцынай хаты, пастукаў лапкай у шыбіну, зажмурыўся ад страху ды прапішчаў спалоханым голасам:

— Дзень добры вам, шаноўныя гаспадары! Прасілі мядзведзь, воўк і дзік, каб вы ласкавы былі, да іх у госці прыйшлі.

Сказаў так адным духам ды ходу назад.

Падрыхтаваліся звяры гасцей сустракаць. Сядзяць ля багатага стала, чакаюць, аб лісіцыным гаспадару разважаюць.

Вось заяц і кажа:

— Не, браткі, сядзець так боязна. Хто яго ведае, які там гаспадар у лісіцы? А што, калі ён абеду нашага не ўпадабае ды ўсіх нас хвастом пазабівае... Давайце лепш схаваемся і спярша здалёк на яго паглядзім.

Згадзіліся звяры з мудрай зайцавай парадай ды пачалі хавацца.

Мядзведзь на дуб узлез, дзік у мох зашыўся, воўк пад куст забраўся, а заяц у траве схаваўся.

Тым часам узяла лісіца пад руку свайго гаспадара, і пайшлі яны ў госці.

Прыходзяць на палянку. Чуе кот — мясам запахла. Бачыць — цэлы баран ляжыць. Тут ён шэрсць наставіў, вусы натапырыў ды адразу на барана накінуўся.

Есць ды ўсё бурчыць: „Мяу-у, мяу-у!"

Звяроў аж страх узяў. Ім здалося, што ён крычыць: „Мала, мала!"

— Ну і звяруга! — кажа воўк. — Мне б і за дзень з такім рагалём не ўправіцца, а яму на раз мала...

Дзік ляжаў, ляжаў у моху ды ад страху пачаў хвастом варушыць. Кот падумаў, што мыш з норкі вылазіць. Скокнуў туды і ўчапіўся кіпцюрамі ў дзікаў хвост.

Як усхопіцца дзік, як кінецца наўцёкі! Толькі галлё трашчыць.

Кот напужаўся ды скок на дуб!

„Ну, — думае мядзведзь,- гэта ён мяне ўбачыў. Трэба ратавацца, пакуль не позна".

Грымнуўся мядзведзь з дуба проста на куст, пад якім воўк сядзеў. А таму здалося, што гэта сам лісіцын гаспадар на яго напаў. Усхапіўся воўк ды ходу далей ад бяды. А мядзведзь за ім: трэсь-лом! трэсь-лом!

Уцякалі яны так, што заяц іх ледзьве праз гадзіну дагнаў. Дагнаў і кажа:

— Каб не паслухалі мяне ды не схаваліся, ён бы нас усіх з'еў! Ну і страшэнны звер!

А кот з хітрай лісіцай нагасцяваліся ды пайшлі сабе дахаты.

8. Выказванні дзяцей на тэму зместу казкі і яе герояў.

9. Вучні дэкламуюць верш „Бабулі" і спяваюць песню „Бабчына памочніца".

10. Развітанне.

++++++

Ларыса Геніюш

У бабусіных унучкаў
Залатыя ручкі:
Умеюць цацкі прыбіраць,
Умеюць хатку замятаць,
Чысціць зубкі, ручкі мыць,
Малачко са шклянкі піць,
Скласці нагавічкі,
Чысціць чаравічкі,
Сваёй маме памагаць
І бабусю пацяшаць.

++++++

— А што яшчэ можна намаляваць з Нуліка?

Бабуля ўзяла зялёны аловак і пачала новы малюнак:

— Нулік бокам. Вушкі тарчма. Вочка. Пятачок. Чатыры ножкі з капытамі. Хвосцік задзёрты. Што атрымалася?

— Парасятка! — адгадаў Міколка.

А з букета кветак пачуліся гукі:

— Рох, рох, рох...

Пакуль Міколка ўпрыгожваў парасятка рознымі колерамі (угадайце якімі), пакуль бабуля хадзіла папіць вады, Нулік паспеў падгаварыць сябра:

— Не рабіце з мяне болей нікога. Давайце лепей пагуляем у хованкі.

Міколка пагадзіўся.

І бабуля падахвоцілася.

Першы хаваўся Міколка. Залез у шафу з адзеннем. І бабуля доўга хадзіла па кватэры, пакуль знайшла ўнука.

А пасля бабуля хавалася. Яна завязала на галаву хустку, толькі вочы былі відаць. Апранула доўгі мамін плашч. На ногі абула боцікі. І стаяла сярод адзення, якое вісела на вешалцы ў прыхожай.

Міколка пачаў бегаць па пакоях, зазірнуў на кухню, у ванную — нідзе бабулі няма. Тут ужо і Нулік выскачыў з кветак, бегаў следам. Бабуля не адгукалася. Міколка спалохаўся, ажно вочы пачырванелі.

І раптам у дзверы пазванілі...

6. Размова пра змест апавядання.

Якія тут героі? Чым яны займаліся? Каго спачатку намалявала бабуля? Якім колерам? Каго намалявала наступным? Якім колерам? Што прапанаваў Міколку Нулік?

7. Настаўнік раздае вучням рысункі кураняці і парасятка для размалёўкі.

8. Настаўнік прапануе вучням намаляваць Нуліка і зрабіць свае малюнкі.

9. Паказ і ацэнка прац.

10. Развітанне.



СВЕТ ЗВЯРОЎ

++++++

• „зайчык" — указальны і сярэдні пальцы разведзены, безыменны і мезенец напаўсагнутыя і нахіленыя да вялікага пальца.

5. Навука песні „Звяртаецца рана".

Звяртаецца рана
да мамы малыш:
— У збане смятаны
Утапілась мыш.

Дык, пэўна ж ты выняў
мыш гэту, сынок?
— Не мама я ўкінуў
Ката у збанок.

6. Вучні паўтараюць верш „Пра ката" і песню „Звяртаецца рана".

7. Развітанне.

Уладзімір Ліпскі

ПРЫГОДЫ НУЛІКА

2. Міколка-ратавальнік

Жыве ў высокім доме, на сёмым паверсе, хлопчык Міколка. Вельмі ж ён пацешны. Выйдзе на вуліцу, сядзе на лаўку і сядзіць, думае. А дзеці гушкаюцца, лётаюць паміж дрэў, у пясочніцы корпаюцца. У яго пытаюцца:

— Што робіш, Міколка?

— Варон пералічваю...

А то скажа, што балконы лічыць у сваім доме, галіны на клёне, кветкі на газоне.

Як толькі не клікалі Міколку: і грамацеем, і матэматыкам... З верасня Міколку пачалі называць Нулікам, бо пайшоў вучыцца ў нулявы клас. Ён, канечне, не вельмі падобны на нуль. Хутчэй на лугавога коніка. Танклявы, падцягнуты, толькі скакаць не любіць. Ходзіць павольна, задуменна.

От аднойчы ішоў ён, пра нешта думаў. А можа, пліты лічыў, па якіх ступаў? Ды раптам аж войкнуў ад знаходкі. Каля самай сцяны ляжаў сапраўдны Нулік. Міколка быццам пачуў яго голас:

— Ратуйце мяне!..

Хлопчык Нулік ухапіў у рукі лічбу Нулік і панёс у сваю кватэру. Бег па лесвіцы і ўвесь час адчуваў у руках не проста абадок з дроціка, а нешта як бы жывое.

Міколка ўскочыў у свой пакой. Паклаў знаходку на белы аркуш паперы, які ляжаў на яго пісьмовым стале. Ухапіў каляровыя алоўкі і пачаў маляваць Нуліку вочы, нос, рот, вушы.

І здарыўся цуд. Вочы ажылі, і сінія «кропачкі» пачалі азіраць Міколку. Нос Нулікаў чмыхнуў. А рот заварушыўся, і ў пакоі пачуўся пісклявы голас незвычайнага госця:

— Дзе я?.. Што са мной?..

Міколка расказаў усё, як было.

Нулік войкнуў:

— Вой, як моцна я ўдарыўся аб сцяну.

— Цяпер у цябе ёсць вочы, будзеш бачыць, куды каціцца, — супакоіў Міколка.

— Хачу не каціцца, а ісці, як ты, — папрасіў Нулік.

Міколка хуценька дамаляваў Нуліку рукі, ногі. На галаве зрабіў прычоску — накруціў маленькіх нулікаў. І перад ім паўстаў жывы Нулік, якога Міколка не бачыў ні ў сваім падручніку, ні ў мульціках.

++++++



++++++

Куры кажуць: “Ко-ко-ко!”
Дзе, бабуля, тая крама,
Дзе купляеш малако?
Ах, унучак, мой салоўка!
Малако дае кароўка.
Зранку дзед яе пасе
На палянцы па расе.

4. Размова пра змест верша і яго герояў.

5. Настаўнік знаёміць вучняў з тэмай урока.

6. Вучні расказваюць пра звяроў, якіх бачылі ў сваіх бабулі і дзядулі на вёсцы.

7. Настаўнік раздае вучням рысункі. Вучні называюць усіх звяроў. Назвы дзелім на склады і на гукі.Вучні вызначаюць, дзе хто жыве (будка, хлеў, клетка, нара).

8. Настаўнік прапануе вучням размаляваць рысункі.

9. Паказ і ацэнка рысункаў.

10. Развітанне.





Іван Бурсаў

КОТ ЗА КРАТАМІ

Ні блізка, ні далёка, недзе там, куды не загляне цікаўнае вока, у прыцемках ды цішы жылі-былі мышы. У мышыных клопатах час праводзілі, карысці не прыносілі, але і не вельмі шкодзілі. Калі, здаралася, і адкалупнуць ад каўбасы ці сыру нейкае каліва — дык хіба гэта шкода?

І не ведалі б мышы ніякіх турбот, калі б не кот. Яно ж спакон так вядзецца: дзе мышы жывуць — абавязкова і кот завядзецца. Вось і жыў па суседству рыжы Кіс, каб ён скіс! Жыцця мышам не даваў — цікаваў, паляваў. Не адна мыш праз гэтага ката засталася без хваста, а якая нябога і зусім без нічога. Але мышы не абураліся: навошта рызыкаваць? На тое яны і мышы, каб трываць.

Аднойчы ўзрушыла ўсіх навіна. Яе прынёс бязхвосты Мыш. Прыбег з двара ды як піскне:

— Ура-а!

Нават павуцінне вакол загайдалася.

Мышы высунуліся хто адкуль, на куртатага Мыша ўставіліся. А той паскроб лапкай за вухам і выпаліў адным духам:

— Усё! Папаўся зладзюга вусаты! Трапіў кот Кіс за краты! Там зараз і сядзіць, мабыць, будуць судзіць...

Мышы спачатку нічога не зразумелі, а потым такі гвалт узнялі, быццам на кірмашы:

— Шу-шу-шу! Шы-шы-шы!..

Да Мыша прыстаюць:

— А ты не мог памыліцца? Дзе сядзіць, кажы?

— На двары, у вязніцы!

Мышам не трэба і каманда: пішчом палезлі на двор паглядзець на ката-арыштанта.

А кот тым часам спаў за бараной, прыхіленай да сцяны, глядзеў свае каціныя сны. І ведаць не ведаў Кіс вусаты, што барана падобна на краты. Ляжыць сабе на дошках, бы вязень у турме, і ў вус не дзьме...

Выкацілася на двор мышыная грамада, згрудзілася вакол ката. Мышы адна адну пад бакі штурхаюць — дзівяцца, разважаюць:

— Хто б мог падумаць! Лю-ба-та! Знайшлася ўправа і на ката!..

— Хай паплача за ўсе перад намі грахі!

— Ха-ха-ха-ха!

— Хі-хі-хі-хі!..

І так мышы гучна смяяліся, з ката кпілі, што ўрэшце яго разбудзілі. Расплюшчыў Кіс левае вока, глянуў навокал, убачыў мышыную грамаду — не па сабе стала кату. Падумаў: «Што гэта за мітынг такі, што за свята? Можа пакуль я спаў, змянілася ўлада? Успомняць мышы пра тое, што я рабіў калісьці, могуць і хвост адгрызці... Трэба пагаварыць з імі ласкава, даведацца, у чым справа?».

Пацягнуўся Кіс, страсянуўся Кіс, пайшоў удоўж сцяны і на волю выйшаў з-пад бараны. Хацеў ветліва запытаць: «Што вам трэба?», ды пасля сну позеху не стрымаў, і атрымалася:

— Мя-я-ў!

І так гэта «мяў» прагучала прачула, што ўсіх мышэй адразу нібы ветрам здзьмула. Шмыгнулі якая куды — далей ад бяды. Лепей жыць, як жылося, у прыцемках ды цішы...

Мышы — яны і ёсць мышы!

++++++

— І рак-тарабун.
— І па бярэзнічку-прыгун.
— І лісіца-добрая маладзіца. А ты хто?
Воўк адказвае:
— А я з-за куста-хапун. І я палезу к вам.
— Ну, лезь! — адказваюць усе.
Улез і воўк.
Трохі спагадзя ідзе мядзведзь. Прыйшоў к рукавічыне, пытаецца:
— Хто ў гэтай рукавічыне жыве?
— Сама паня-пацягуня.
— І рак-тарабун.
— І па бярэзнічку-прыгун.
— І лісіца-добрая маладзіца.
— І з-за куста-хапун. А ты?
— А я зверху-паціскун. Пусціце мяне к сабе.
— Не, не, — крычаць усе, — у нас недзе — адказваюць усе.
— Ну, я зверху сяду, — гаворыць мядзведзь.

Узлез наверх, як ціскануў. І паціснуў усіх на праснак. Злез з рукавіцы, падняў беражок, паглядзеў. Аж усе і паціснуты!

3. Размова пра змест казкі. Дзеці называюць звяроў з казкі. Назвы дзеляць на склады і гукі.

4. Вучні імітуюць рухі звяроў з казкі, скачуць як жабкі і зайчыкі, поўзаюць як ракі, ходзяць як лісіцы, ваўкі і мядзведзі.

5. Настаўнік паказвае дзецям „Звяры-складанкі" з паперы і прапануе ім зрабіць такіх жа.

Для складанак патрэбныя квадраты 25 на 25 сантыметраў зялёнай, шэрай, аранжавай, чорнай і карычневай паперы. Дзеці такую складанку называюць часта „пекла-неба".

Квадрат складаем на палавіну, раскладаем і складаем яшчэ раз супрацьлегла да атрыманай раней лініі згібу. Зноў раскладаем паперу. Цяпер яна падзеленая на чатыры аднолькавыя квадраты.



Цяпер па чарзе загінаем усе рогі ўсярэдзіну так, каб зноў атрымаўся квадрат (меншы чым раней). Адварочваем яго загібамі ўніз.



Зноў загінаем усярэдзіну ўсе рогі. Цяпер наш квадрат яшчэ меншы.



Квадрат адварочваем загібамі ўніз, бачым цяпер чатыры малыя кішэнькі.



Вялікія і ўказальныя пальцы абедзвюх рук усоўваем у кожную кішэньку. Раскладаем і маем гатовую складанку.

Чарговыя крокі залежаць ад таго, якога звяра робім.

Жаба Усе верхавіны загінаем усярэдзіну і прыклейваем. Адварочваем і склейваем згары і знізу.



Робім вочы, язык, прыклейваем гэта і нашая жаба ўжо гатовая.



Лісіца Загінаем толькі ніжнія рогі. Адварочваем і клеім згары і знізу. Надрэзваем зверху. Робім язык, вочы, зубы і прыклейваем іх у адпаведных месцах. Лісіца таксама гатовая.



Такім жа чынам робім астатніх звяроў.

6. Спробы інсцэніроўкі казкі.

7. Развітанне.

Авяр'ян Дзеружынскі

АВЕЧКІ

Я пасу авечкі
Каля самай рэчкі,
Воўна ў іх
Бялюткая,
Мяккая,
Танюткая.
Будзе
На валёнкі,
Будзе на панчошкі
І на рукавічкі
Застанецца трошкі.

++++++

++++++

— Чы-чы-чы-це!
Не крычы-чыце!
Лепей крыху памаўчы-чыце!
Сёння ўначы-чы-чы
Прыляцелі з поўначы-чы-чы,
Селі на галінку
Адпачы-чыць хвілінку
Даўнія сябры.
Зваць іх...

Птушыны гоман заглушыў апошнія словы сарокі. А можа, вы, ведаеце, пра якіх птушак яна казала?

5. Размова пра змест тэксту.

Хто з птушак падняў перапалох? Чаму сарока крычала: „Пажар"? Як называецца маленькая скрыначка з прыпасамі для птушак? Чаму яна так называецца? Ці вы бачылі птушку з жоўтым жывоцікам? Як яе зваць? Чым любіць ласавацца сінічка? Калі адбываюцца падзеі казкі — зімой, вясной, восенню ці летам?

Падчас размовы і адказаў на чарговыя пытанні настаўнік паказвае здымкі птушак. Назвы птушак дзелім на склады і гукі.

6. Гульня „Верабейка".

Вучні становяцца ў кола, пасярэдзіне — „верабей". Карагод спявае:

Як пайшоў верабей
На сметнічку,
Сабіраў, сабіраў
Усю дружыначку.
Мала нас, мала нас
На булачку хлеба,
Пазваць, пазваць
Каго яшчэ трэба.
Тут „верабей" называе, каго ён выбраў. Дзеці спяваюць далей:
— Яшчэ мне, яшчэ мне ..... (імя) трэба.

Пасля кожнага паўтарэння песні „верабей" забірае да сябе каго-небудзь з карагода. Ходзяць і спяваюць пакуль не застанецца з круга двое. Тады не выбраныя рухаюцца ў другі бок і спяваюць:
Як пайшоў верабей
На сметнічку,
Раскідаў, раскідаў
Усю дружыначку.
Многа нас, многа нас
На булачку хлеба,
Пазваць, пазваць
Каго яшчэ трэба.
Цяпер „верабей" называе таго з дзяцей, каго хоча аддаць, а ўсе спяваюць:
— Ужо мне, ужо мне ... (імя) не трэба.

Так гуляем, пакуль „верабей" не аддасць усіх, каго ён узяў да сябе.

7. Развітанне.

++++++

ГУКАЕМ ВЯСНУ

++++++

++++++

НАШАЯ МАЛАЯ АЙЧЫНА

++++++

++++++

++++++

5. Настаўнік прапануе вучням размаляваць беларускі гістарычны герб — Пагоню.

Звярніце ўвагу на патрэбныя для размалёўкі колеры: чырвоны — фон, залаты або жоўты — крыж на шчыце.

6. Паказ гербаў.

7. Развітанне.



НАШАЯ АБРАДНАСЦЬ

++++++

— Пірагі касцам. Касцы накосяць сена. Сена — карове. Карова дасць масла. Масла — пеўніку, бо пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.

Пекар кажа:

— Збегай у лес, прынясі дроў, каб было на чым пірагі пячы.

Пабегла курачка ўлес і прынесла дроў.

Пекар напёк пірагоў.

Занесла курачка пірагі касцам. Касцы з'елі пірагі й накасілі сена.

Прынесла курачка сена карове.

Карова з'ела сена і дала масла.

Пеўнік змазаў горла і праглынуў бобінку.

Праглынуў і зноў весела на ўвесь двор заспяваў:

— Ку-ка-рэ-ку! Чуб-чубатка — маладзец!

Тут і казцы канец.

4. Выказванні дзяцей на тэму зместу казкі.

Настаўнік павінен звярнуць увагу дзяцей на чарговыя падзеі, старацца вусна стварыць план казкі неабходны для далейшай працы.

5. Падзел вучняў на групы.

Настаўнік можа гэта зрабіць з дапамогай лічылкі.

Котіласе торба
З высокого горба,
А в туой торбі
Грох, пшэніця.
З кім ты хочэш
Поділіцца?

6. Выкананне ў групах коміксаў да казкі „Як курачка пеўніка ратавала".

7. Паказ і ацэнка прац.

8. Развітанне.

++++++

Мама мілая, павер:
З рук маіх, нібы з гняздзечка,
Не ўпадзе ў траву цяпер
Велікоднае яечка.

7. Развітанне.



X.Y.X.



ХРЫСТОС
ВАСКРОС



++++++

3. Сабрала бабка яечкі і паставіла на паліцу.
4. Мышка бегла, хвосцікам махнула і скінула яечкі.

5. Плача дзед і плача бабка.

6. Курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сарокі трашчаць, гусі крычаць, сабакі брэшуць.

7. Ідзе воўк.
   1, 2, 3, 4, 5

8. Ідзе мядзведзь з куртатым хвастом.

9. Размова ваўка і мядзведзя.
   1, 2, 3, 4, 5

8. Спробы перадачы зместу, паводле рысункаў, вучнямі.

9. Размалёўка вучнямі выбраных рысункаў.

10. Паказ і ацэнка прац.

11. Развітанне.



++++++

++++++

Ў руках застанецца,
Шмат нітак бабуля
З ільну напрадзе.
Натчэ палатна,
У вадзіцы вясновай
Адбеліць на чыстым
Грудку ля ракі -
І ўнуку пашые
Кашулю-абнову
На зайздрасць усім
Сябрукам гарадскім.

8. Паказ альбома Міхася Раманюка „Беларускія народныя строі".

9. Развітанне.

++++++

++++++


1
2
3

1



2

3

НАШЫЯ МАМЫ

++++++

5. Расказ настаўніка пра падрыхтоўку святочных падарункаў на Дзень маці — кніжачак „Мая мама".

Настаўнік рыхтуе кожнаму вучню „кніжачку" са сшытых картак А4. На кожнай старонцы надрукаваныя загалоўкі: вокладка — Мая мама, затым — Праца маёй мамы, Мая мама любіць, Маёй маме жадаю, Кветка маме. Можна прыдумаць іншыя старонкі.

6. Выкананне рысунку на старонцы „Праца маёй мамы".

7. Развітанне.

++++++

++++++



++++++

ЧАКАЕМ ЛЕТА

++++++

++++++

++++++

Правяду аранжавым сонечную стужку.
Жоўтую, зялёную, колеру нябёсаў.
За блакітнай сіняя заблішчыць дзівосна.
Сёмым фіялетавы колер мне патрэбен -
і вясёлка радасна ўспыхнула ў небе!

9. Прэзентацыя кніжкі Віктара Шведа „Вясёлка".

10. Вучні дэкламуюць верш „Вясёлка" і называюць свае любімыя колеры.

11. Развітанне.

++++++

цячы пакой. Убачыла размаляванага Міколку і ледзь не абамлела:

— Божачка мой, што ты, унучак, зрабіў з сабой?

— Гэта мы... Гэта я... Гуляў у вясёлку...

Нулік хіхікнуў з-пад стала.

Міколка засмяяўся.

А бабуля ўзялася за галаву.

5. Размова пра змест апавядання. Ацэнка Міколкі і Нуліка вучнямі.

6. Гульня „Фарбы".

Для гульні выбіраем „гаспадара" фарбаў і „адгадчыка" Яся. Усе астатнія дзеці — „фарбы".

Ясь адыходзіць убок, а „гаспадар" і „фарбы" ціхенька дамаўляюцца: хто будзе якой фарбай. Назвы фарбам дае „гаспадар" або кожны сам выбірае сабе назву, але такую, каб двух аднолькавых колераў не было. „Гаспадар" павінен добра запомніць, хто якой „фарбай" будзе. Калі колеры размеркаваны, „фарбы" і „гаспадар" сядаюць і робяць выгляд, што засынаюць. Тут прыходзіць Ясь, стукае некалькі разоў у дзверы і кажа:

— Тук, тук!

„Гаспадар" прачынаецца, устае і пытаецца:

— Хто там?

— Гэта Ясь!

— Па што прыйшоў?

— Па фарбу!

— Па якую?

Ясь называе які-небудзь колер, напрыклад:

— Па сінюю!

Калі такога колеру сярод „фарбаў" няма, „гаспадар" кажа:

— Такой фарбы ў нас няма!

А ўсе „фарбы" пляскаюць у далоні і прыгаворваюць:

— Пайдзі за сівенькі лясок,

Знойдзеш сіні чабаток.

Панасі, панасі,

І нам прынясі!

Ясь адыходзіць убок, потым вяртаецца і вядзе з „гаспадаром" ранейшую гутарку.

Калі „фарба", якую просіць Ясь, ёсць, ён адводзіць яе ў „хату", а потым зноў вяртаецца да „гаспадара" за новай. Калі Ясь паадводзіць усе „фарбы", гульня канчаецца.

7. Развітанне.

++++++

Рыба-Рыбіна-піла
Да Какоса падплыла,
Пілавала, пілавала,
Але пілка не стрывала —
Затупілася!

Вынырнула Рыба-меч.
Хто шукае з ёй сустрэч?
Біла! Біла!
Не зрабіла
Вострым мечам
У Какосе Маракосе
Нават цечы!

Падышла Акула-молат!
Бух і бах! — Не раскалола!

Какос Маракос шпарчэй
Плыве сваім шляхам далей!

Электрычны Скат
Побач з ім кружыцца,
Выпусціў разрад,
Бліснуў бліскавіцай!
А Какосу не бяда,
Не падпаліцца вада!

Вось яго даганяе Кальмар
І дзюбай прыносіць удар,
Тук-тук, удар моцны, падвойны!
А Какос прамаўляе спакойна:
Ты мне з такой дзюбай, Кальмарык,
Нібы для Чарапахі — Камарык!

Зрабілася злосна Кальмару,
Ён выдзьмухнуў чорную хмару!

Какос Маракос шпарчэй
Плыве сваім шляхам далей!

Лятучая рыба Хейлапагон
Ляціць — хэй-ла! Хэй-ла! — яму наўздагон.

Ляцела,глядзела і кажа паважна:
„З такім пасябрую — ён добры, адважны!"

Кіт падняўся з глыбіні
За Какосам плыў тры дні,
Уздыхаў і пыхцеў,
Праглунуць Какос хацеў.
А Какос і не баяўся,

Бо ён добра навучаўся -
Ведаюць какасаняткі,
Што ў Кіта у глотцы краткі!
Пырснуў Кіт над ім фантан
І сышоў у акіян!
Какос Маракос шпарчэй
Плыве сваім шляхам далей!
А Дэльфіны і Касаткі
Падзяліліся ў два статкі,
Пачалі з ім хвастабол!
Тым і тым забілі гол!

Кірлі-чайкі, Альбатросы,
Падляталі да Какоса,
Сядуць, скажуць: «Малайчынка!
Даў нам трошкі адпачынку!»

Апусціўся Пелікан —
Ам!
Арэх —
У дзюбу мех!
Ды пачуў птушыны смех:
Не ўзляціць з ім Пелікан,
Кінуў зноўку ў акіян.

Нават хітры Васьміног,
Расчапіць Какос не змог!
І падобна на Кальмара,
Выпусціў у мора хмару.

Какос Маракос шпарчэй
Плыве сваім шляхам далей!

На рыфе падводным, на карале,
Марскія жывёлкі ў гульні гулялі:
Зоркі
З каменнай спускаліся горкі,
Крабікі
Рабілі з ракушак караблікі.
Вожыкі
На дне кідалі ножыкі,
А Медузкі і Малюскі,
І Канькі, і Акунькі,
І Крэветкі, і іх дзеткі -
Бавіліся
Ў хованкі.
(...) Узнікла тут жа Камбала:
„А я заўжды вунь там была,
Каменьчык донны і пясчынку
Намалявала я на спінку".

Жывёлкі Какосу казалі:

„Жыві, Маракос, на карале!”
Ён з імі пабыў нямнога,
Паведаў: „Пара ўжо ў дарогу,
Было ў вас ярчэй, весялей,
Але трэба ісці далей!”

І Какос па хвалях — скок,
Потым выплыў на пясок...

Там на востраве Какос
Новай пальмаю прарос.

4. Выказванні вучняў пра змест тэксту.

5. Паказ здымкаў марскіх звяроў.

6. Вучні ў групах рыхтуюць працы „Акіян”.

Сценкі абутковай скрынкі дзеці фарбуюць у сіні колер. Адну сценку (гэта будзе дно) мажуць клеем і пасыпаюць жоўтай крупкай або пяском. Прапануйце вучням выканаць з кардону і пластыліну марскіх жыхароў, калі яны гатовыя, трэба іх прыклеіць або замацаваць на нітцы.

7. Паказ і ацэнка прац.

8. Развітанне.

++++++

8. Вучні ў 4 групах рыхтуюць малюнкі на тэмы:

Канікулы над вадою.
Канікулы ў бабулі.
Канікулы ў горах.
Канікулы ў хаце.

9. Паказ і ацэнка прац.

10. Пажаданні настаўніка на канікулы.

11. Развітанне.

ЗМЕСТ

Я ЎЖО ВУЧАНЬ с. 7 - 23

1. Азнаямленне з імёнамі дзяцей. Інтэграцыйныя гульні з выкарыстаннем словазлучэнняў: мяне (яго, яе) завуць..., ён (яна) называецца... Навука верша „Ветлівыя словы".
2-3. Навука песні „Нам сем гадоў". Падзел імёнаў дзяцей на склады і гукі.
4-5. Азнаямленне з назвамі звязанымі з тэмай „Наш клас": парта, крэсла, дошка, крэйда, паліца, сметніца. Гульня „Сляпы музыка".
6-7. Азнаямленне з назвамі школьных прадметаў: сшытак, кніжка, пенал, аловак, доўгапіс, каляровыя алоўкі, гумка, фарбы, пэндзлік, заплечнік. Падзел слоў на склады і гукі. Навука верша „Рэчы не ўзніклі самі".
8. Гутарка на тэму: „Мая дарога ў школу". Азнаямленне са словамі: дарога, вуліца, пераход, светлафор, дарожны знак, вёска, горад.
9-10. Навука песні „Першакласнікі" і верша „Кулачок".

Я І МАЯ СЯМ'Я с. 24 - 41

11. Гутарка на тэму : „Мая сям'я" на аснове здымкаў. Навука вершыкаў: „Пальчыкі", „Дзе былі".
12-13. Азнаямленне вучняў з назвамі частак твару. Навука верша „Маміна дачушка".
14. Азнаямленне са словамі звязанымі з тэмай „Асабістая гігіена" (мыла, зубная шчотка, зубная паста, грэбень, хустачка, люстэрка, душ).
15-16. Выказванні вучняў на тэму: „Чаму трэба мыць рукі і чысціць зубы?". Выкананне плакатаў.
17-18. Азнаямленне са словамі звязанымі з тэмай „Мой дом": хата, кватэра, пакой, кухня. Назвы хатняй абстаноўкі.
19-20. Гутарка на тэму: „Нашыя ўлюбёныя цацкі". Азнаямленне з назвамі цацак: кубікі, лялькі, плюшавыя цацкі, мячык і г.д.
21. Навука песні „Паяц".

УЖО ВОСЕНЬ с. 42 - 64

22-23. Азнаямленне з назвамі садавіны. Гульня „Кампот".
24-25. Навука верша „На здароўе!" і песні „Грушка".
26-27. Азнаямленне з назвамі агародніны. Гульня „Рэдзька". Навука верша „Градкі".
28. Адказ на пытанне: „Што неабходнае раслінам для росту?". Навука вершыка „Бурак".
29-30. Навука песні на словы Андрэя Хадановіча з музыкай Анны Бабік „Каштаны".
31-32. Інсцэніроўка казкі пра рэпку. Гульня „Агароднік".
33-34. Гутарка на тэму: „Што прыносіць восень?". Навука верша „Восень". Гульня „Кропіць дожджык".
35-36. Робім запрашэнні на сустрэчу „Развітанне з восенню". Прыпамінаем вядомыя вершы, песні і гульні.
37-38. Сустрэча „Развітанне з восенню". Адкрытыя заняткі беларускай мовы.

ЗІМОВЫЯ ГУЛЬНІ с. 65 -71

39-40. Чаму дзеці любяць зіму? Нашыя зімовыя гульні.
41. Навука песні „Вясёлая зіма".
42-43. Што малюе мастак-мароз? Навука верша „Снег".
44-45. Навука верша „Снегавік". Робім снегавіка.

ЭЙ, КАЛЯДАЧКІ... с. 72 - 81

46-47. Паказ фільма „Маленькая калядная казка".
48. Навука песні на словы Віктара Шведа „На санках Міколка".
49-50. Робім цацкі на ёлку. Навука калядкі „Свецяць, свецяць зорачкі".
51. Навука калядкі „Саўка ды Грышка". Гульня „Вецер дзьме на...".

НАШЫЯ БАБУЛІ с. 82 - 94

52-53. Візіт у старой бабулінай хаце.
54-55. Чым займаліся нашыя бабулі ўзімку? Гульня „Мышка".
56-57. Навука песні „Бабчына памочніца" і верша „Бабулі".
58. Навука танца „Ойра".
59-60. Выказванні вучняў на тэму тэксту „Бабуліны гулі". Нашыя малюнкі.

СВЕТ ЗВЯРОЎ с. 95 - 114

61. Навука песні „Звяртаецца рана" і верша „Пра ката".
62-63. Гульня „Чорны кот". Партрэт ката.
64-65. Гутарка на тэму: „Якіх звяроў разводзіць бабуля?". Азнаямленне з назвамі свойскай жывёлы.
66-67. Гутарка на тэму казкі „Дзедава рукавічына". Азнаямленне з назвамі звяроў з казкі.
68. Навука песні „Стара бабуленька козліка мела". Гульня „Пакажы жывёлу".
69-70. Азнаямленне з назвамі птушак, якія жывуць побач нас. Гульня „Верабейка".
71-72. Навука песні „Самотны папугай".

ГУКАЕМ ВЯСНУ с. 115 - 117

73. Навука песні „Я вясну гукаю".
74-75. Азнаямленне з назвамі веснавых кветак. Гульня „Дрома"

НАШАЯ МАЛАЯ АЙЧЫНА с. 118 - 122

76-77. Экскурсія „Што цікавае ў маёй мясцовасці".
78. Робім паштоўку са сваёй мясцовасці.
79-80. Нашыя сімвалы. Навука песні „Сцяг".

НАШАЯ АБРАДНАСЦЬ с. 123 -154

81-82. Робім комікс да казкі „Як курачка пеўніка ратавала".
83. Як людзі рыхтуюцца да Вялікадня? Навука верша „Велікоднае яечка"
84-85. Казка „Курачка-рабка".
86. Навука народнай песні „Там по маёвуй росі...".
87-88. Адкуль бярэцца палатно? Паказ народнай вопраткі. Гульня „Лянок".
89. Навука песні і танца „Лявоніха".
90-91. Глядзім фільм „Выцінанка-выразанка". Робім свае выцінанкі.

НАШЫЯ МАМЫ с. 155 - 160

92-93. Гутарка на тэму: „Праца маёй мамы". Навука верша „З мамай добра мне". Робім кніжку маме.
94. Партрэт маёй мамы.
95-96. Што любіць мая мама? Навука песні „Кветка маме".
97. Навука верша „Тата". Гульня „Вазьмі і перадай".

ЧАКАЕМ ЛЕТА с. 161 - 174

98-99. Глядзім беларускія мульцікі. Дзень дзіцяці.
100. Навука песні „Пра добрую мышку і і мудрую кошку". Гульня „Маша".

101-102. Колеры вясёлкі. Навука верша „Вясёлка".
103. Выказванні вучняў на тэму тэксту „Вясёлкавыя сябры". Гульня „Фарбы".
104-105. Азнаямленне з назвамі марскіх жывёлаў на аснове кніжкі Сержа Мінскевіча „Прыгоды Какоса Маракоса".
106-107. Нашыя планы на канікулы. Развітальная сустрэча.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. А. Ваўранюк , Беларускія гульні, Беласток 1998
2. А. Ваўранюк, Кругагод, Беласток 2000
3. А. Ваўранюк, Сцэнарыі заняткаў па беларускай мове для І класа, Беласток 2000
4. Скарбонка гульняў, склад.Губарэвіч Іна, Мінск 2005
5. В. Кукса, Колеры вясёлкі. Вучымся гаварыць па-беларуску, Мінск 1998
6. З. Кустава, Азбукоўнік і лічылка, Мінск 2012
7. Л. Лысюк, Давайце гуляць разам, Мінск 1995
8. Н. Старжынская, Беларуская мова ў дзіцячым садзе, Мінск 1995
9. Н. Старжынская, Сябруем і гуляем разам, Мінск 1994
10. Я. Удальцоова, Н.Старжынская, Дыдактычныя гульні ў дзіцячым садзе, Мінск 1988
11. Т. Шылько, Скажы па-беларуску, Мінск 2004
12. Беларускія народныя казкі, склад. А. Якімовіч, Мінск 1990
13. Беларусазнаўства. Зборнік №1, пад кірункам А. Лозкі, Мінск 1992
14. Н. Сокалава-Кубай, Узоры из бумаги. Белорусская выцинанка, культура и традиции, 2006
15. Ларыса Геніюш, ...унукам. Вершы і лісты. Без цэнзуры, Мінск 2018